# ДУХОЎНАЯ СПАДЧЫНА ПЛАТОНА ЦІХАНОВІЧА – СВЯТАРА, НАСТАЎНІКА, ПАТРЫЁТА

***С.І. МАКАРЭВІЧ***
*Пінск, ПалесДУ*

*Памяці пісьменніка-краязнаўца*
*Мікалая Васільевіча Елянеўскага*

Кожная зямля славіцца сваёй гісторыяй, значнымі падзеямі, знакамітымі людзьмі, якія стваралі матэрыяльныя і

ПолесГУ

духоўныя багацці, зберагалі іх, каб перадаць нашчадкам. Імі па праву ганарацца суайчыннікі. Аднак ёсць імёны, што быццам страціліся у цемры стагоддзяў. Таму у наш імклівы час гэтыя асобы вартыя таго, каб іх імёны памяталі, ведалі і шанавалі, а ў справе выхавання – бралі прыклад.

Да такіх людзей хочацца аднесці імя таленавітага палескага святара, этнографа і філолага, пакінуўшага асаблівы і непаўторны след у гісторыі нашай Піншчыны – Платона Максімавіча Ціхановіча.

Да апошняга часу імя і сфера духоўнага жыцця гэтага дзеяча былі амаль невядомы. Больш за 180 гадоў мінула з дня нараджэння Ціхановіча, таму нядзіўна, што гісторыя захавала пра яго не багатыя звесткі, аднак і яны дазваляюць убачыць гістарычнае значэнне гэтай асобы. Святар Ціхановіч пакінуў адметны і непаўторны след, бо лічыцца, што менавіта ён з’яўляецца аўтарам малавядомай навукоўцам-лінгвістам кнігі “Беларуская граматыка”, напісанай на мясцовым дыялекце. У сваёй працы ён паспрабаваў уберагчы ад занядбання духоўную спадчыну роднага краю – бацькоўскую мову. Дакладна рукапіс П. Ціхановіча не вывучаўся навукоўцамі, таму застаецца толькі здагадвацца, чаму аб існаванні граматыкі ведаюць далёка не ўсе мовазнаўцы.

З гісторыі вядома, што ў пачатку XX ст. вучоныя-этнографы Я. Карскі і А. Сержпутоўскі падрыхтавалі навуковыя працы па беларускай мове[2]. Не будзем таксама забываць, што аўтарам першай беларускай граматыкі традыцыйна лічыцца Браніслаў Тарашкевіч. Аднак гэта адбылося ў 1908-1916 гг., амаль праз сорак гадоў пасля граматыкі Ціхановіча, калі верыць знойдзеным матэрыялам.

Новым крокам у вывучэнні творчай спадчыны П. Ціхановіча з'явіліся сенсацыйныя даследаванні члена Саюза пісьменнікаў Беларусі і Расіі, члена Беларускага саюза журналістаў, мясцовага краяведа Мікалая Васільевіча Елянеўскага, які ў асобе духоўнага дзеяча Платона Ціхановіча ўбачыў адукаванага чалавека свайго часу.

Менавіта Елянеўскі, па знойдзеных матэрыялах, з поўным правам заявіў, што наш зямляк, “святар Платон

Полесгу

Максімавіч Ціхановіч з’яўляецца адным з пачынальнікаў руху за развіццё і станаўленне роднай беларускай мовы”[2].

Больш за трыццаць гадоў прысвяціў М. Елянеўскі збору звестак пра аўтара першай граматыкі. Трэба адзначыць, што сам Мікалай Васільевіч родам з в. Лунін, дзе большую частку свайго жыцця праслужыў П. Ціхановіч. Дзякуючы пошукам мясцовага краяведа было вернута з нябыту імя і справа святара.

Чым жа варты ўвагі і чым цікавы гэты духоўны дзеяч для нас, пінчукоў?

Платон Максімавіч Ціхановіч пачынаў сваё жыццё на Піншчыне. Бацька будучага святара Максім Данілавіч Ціхановіч скончыў ў 1830 годзе Мінскую духоўную семінарыю і пачаў служэнне псаломшчыкам у віленскім Свята-Духавым манастыры. [4]. Праз некаторы час, у 1832 ён быў высвечаны на святара і накіраваны служыць у Вылазскую царкву, што знаходзілася ў Пінскім павеце, дзе спавядаў хрысціянскую веру і славіўся ўсялякімі набожнасцямі.

Паводле інфармацыі М. Елянеўскага [1, с.109], Платон Ціхановіч нарадзіўся ў в. Вылазы Пінскага павета 4 лістапада (18 лістапада) 1836 годза. Там жа Платон быў крэшчаны ў мясцовай царкве Раства Багародзіцы. Ніякіх ілюзій наконт невычайнасці яго далейшага лёсу ў бацькоў не было. Лёс жа распарадзіўся па-свойму…

Першынец Платон рос у мнагадзетнай сям'і: у яго былі дзве сястры Алена і Вольга, брат Стэфан. Першапачатковую хатнюю адукацыю Платон атрымаў дома пад наглядам маці і бацькі. Выхаваны ў глыбока праваслаўнай сям'і, Ціхановіч з дзяцінства ўсведамляў свой праўдзівы шлях, пакліканне, якому ён павінен прысвяціць жыццё – служэнне Богу.

У 1843 годзе бацьку Платона Ціхановіча перавялі на новае месца службы і прызначылі прыходскім святаром у Глінянскую царкву, а ў 1857 г. – у Свята-Міхайлаўскую царкву, што ў в. Хатынічы Пінскага павета (зараз – Ганцавіцкі раён). З 1852 па 1868 гг. яго бацька з’яўляўся благачынным, быў адзначаны ордэнам Св. Ганны 3-й ступені [4]. Менавіта тут прайшло дзяцінства будучага святара-філолага.

ПолесГУ

Як адзначалася ў знойдзеных крыніцах, Платон, паспяхова здаў экзамены і паступіў у Пінскае духоўнае вучылішча. Атрымаўшы неабходнае бацькоўскае благаслаўленне на вучобу Платон магчыма меў добрыя поспехі ў навучанні, бо пасля заканчэння вучылішча быў атэставаны як здольны вучань. Больш пра яго вучобу ў духоўным вучылішчы звестак няма.

Па сцвярджэнню Н.В. Елянеўскага, вядома, што з 1855 па 1860 гг. П. Ціхановіч вучыўся ў Мінскай духоўнай семінарыі, спачатку "за своекоштный счет", дзе грошы за вучобу вылічаліся з жалавання бацькі, але за добрую вучобу пасля 1 курса быў пераведзены на паўказённы кошт [1, с. 124].

Скончыўшы семінарыю па другому разраду, П. Ціхановіч быў пасвечаны ў духоўны сан і прызначаны святаром Выганашчанскай царквы Пінскага павета, цяпер гэта Івацэвіцкі раён [2]. На сваё першае месца службы ён прыехаў разам з жонкай Аляксандрай Якаўлеўнай.

Аднак ў 1861 годзе ў сямейным жыцці Платона Максімавіча здарылася трагедыя – загінула жонка. Гэта прымусіла яго па ўласнай просьбе змяніць месца службы і перавесціся ў Лунінскую Барыса-Глебскую царкву, дзе ў П. Ціхановіча пачынаецца новы этап біяграфіі [2].

Святар Платон Максімавіч выконваў звычайныя абявязкі, уласцівыя яго звання: вучыў дзяцей грамаце ў школе, выступаў з пропаведзямі перад прыхаджанамі, адпяваў пакойнікаў, вянчаў маладых, асвячаў жыллё, гаспадарчыя пабудовы… Ён імкнуўся прывабіць ў царкву моладзь, карыстаўся даверам і павагай прыхаджан. З дапамогай Бібліі вучыў сваю паству дабру і міласэрнасці, не азлабляцца, захоўваць любоў у сваім сэрцы.

Таксама з успамінаў мясцовых жыхароў старэйшага пакалення вядома, што П. Ціхановіч любіў богаслужэнні. Святар не толькі лічыў малітву абавязковым сродкам выратавання, але і сам па-майстэрску валодаў мастацтвам складання малітвы. Можа таму і была Лунінская Барыса-Глебская царква цэнтрам духоўнага жыцця, куды людзі цягнуліся не з прымусу, гэта была патрэба іх хрысціянскіх душ. Пропаведзі

Полесгу

прыходскага святара Платона Ціхановіча аказвалі дабратворны ўплыў на маральны стан мясцовых прыхаджан, адрозніваліся шчырасцю і прастатой, накіроўвалі іх думкі да Бога.

Клапоцячыся аб адукацыі прыхаджан, святар Ціхановіч пачаў весці размовы аб адкрыцці ў сяле народнага вучылішча. Ён пераконваў паству, што неабходна вучыць дзетак, даказваў, што лепшая доля прыходзіць да тых, хто ідзе наперад праз навуку, праз адукацыю [1, с.166]. Дзякуючы намаганням святара ў 1864 г. была ўрачыста адкрыта народная школа, якую па распараджэнню Галоўнага Начальніка краю афіцыйна назвалі Лунінскае народнае вучылішча [1, с.173]. Платон Максімавіч быў тут першым настаўнікам “законоучителем и преподавателем языка”, вучыў сялянскіх хлопчыкаў пісьму і чытанню, Закону Божаму. Згодна М. Елянеўскага, школьны стаж святара Ціхановіча склаў 55 гадоў [1, с.101].

Таксама з дапамогай П. Ціхановіча ў Луніне была створана народная бібліятэка, у якой працавіты святар сам пераплятаў старадаўнія кнігі [1, с. 169].

У шэрагу з педагагічнымі абавязкамі П. Ціхановіч займаўся адміністрацыйнымі і гаспадарчымі справамі. З успамінаў мясцовых жыхароў, святар прыклаў шмат асабістых намаганняў да ўпарадкавання храма. Ён зрабіў новы дранкавы дах, абшыў звонку сасновымі дошкамі, узвёў новую асобную званіцу, падтрымваўваў парадак у храме, і прыхаджане любілі наведваць храм, службу, умацоўваць веру ў сябе, маліцца [1, с.189].

У клопатах аб храме дапамогу святару Ціхановічу аказвалі сяльчане.

Згодна М. Елянеўскага, пры непасрэдным удзеле і настойлівасці Ціхановіча ў суседняй вёсцы Вулька 1, якая ўваходзіла ў Лунінскі прыход, у снежні 1885 г. адкрываецца школа пісьменнасці, якая была па невядомых прычынах зачынена раней [3, с. 149]. Стараннямі святара былі сабраныя першыя грошы сярод аднавяскоўцаў на гэтую богаўгодную справу.

Палесдзу

Безумоўна, для вядзення нармальнага навучальнага працэса неабходна было забяспечыць вучняў патрэбнай літаратурай. Гэтае пытанне стаяла надзвычай востра, бо нехапала патрэбных падручнікаў, таму ўсе вучэбныя дапаможнікі для гэтай школы падрыхтаваў сам Платон Максімавіч. Відавочна, што ён актыўна садзейнічаў развіццю народнай асветы [3, с. 149].

Да таго ж трэба адзначыць, што добрасумленнае выконванне сваіх пастырскіх абавязкаў узмацняла аўтарытэт святара сярод прыхаджан.

Тым больш незразумела распараджэнне епархіяльнага начальства, датаванае 1887 годам, дзе сярод іншых Платон Ціхановіч прылічваецца да "не позаботившихся об открытии в своих приходах вопреки распоряжению высшего начальства и воле монарха" царкоўнапрыходскіх школ, "поставляется на вид такое небрежное их отношение к своим обязанностям и вменяется им в непременную обязанность позаботиться об открытии в своих приходах церковноприходских школ" [3, с.149].

Думаецца, святар Платон быў добрым і клапатлівым пастырам для сваіх суайчыннікаў. Ён вучыў памятаць пра хуткаплыннасць жыцця, аб адказнасці перад вечнасцю за нашы справы і ўчынкі, лічыў сваім абавязкам ахоўваць чысціню праваслаўнай веры.

На жаль, паўней прасачыць і прааналізаваць гэтую старонку дзейнасці Платона Ціхановіча няма мажлівасці, яна недастаткова вывучана.

Знойдзеным запісам, датаваным 1873 г., адзначана, што "священник вдов, не имеет детей, дом старый, усадьба удобная" [3, с. 149]. Магчыма, маецца на ўвазе, што Ціхановіч жыў адзін. Як сцвярджае М. Еляневўскі, у 1869 г. да Платона пераехала жыць сям'я сястры Алены з Хатыніч, каб дапамагаць весці дамашнюю гаспадарку. А калі захварэў і памёр яе муж Платон Максімавіч сам стаў апорай і памочнікам сястры: выдаваў замуж яе дочак і сам вянчаў іх у Лунінскай царкве [1, с.188]. Сустракаюцца яшчэ асобныя супярэчлівыя дакументы, якія пакрыху тлумачаць пра лунінскі перыяд жыцця святара. І вось час ад часу, дзякуючы нававыяўленым



Полесгу

архіўным дакументам і ўспамінам сведкаў, праясняюцца некаторыя дэталі праваслаўнага служэння П.М. Ціхановіча.

Сістэма каштоўнасцей, склаўшаяся ў светапоглядзе святара ўключала ў сябе ідэю міласэрнасці, накшталт дапамогі жывучым у нястачы, абдзеленым, галодным. Вядома, што лунінскі святар актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці. У 1882 г. пры яго падтрымцы насельніцтва прыхода арганізавала збор грашовых сродкаў на дапамогу пацярпеўшым ад неураджаю 1891 года ў Расіі [3, с.149].

Быўшы ўпэўненым, што праблема духоўнага адраджэння Айчыны заўжды актуальна, П. Ціхановіч шукае шляхі яе вырашэння.

Перш за ўсё, разумеючы, важнасць асветы для народа, што самае галоўнае багацце культуры людзей Палесся – гэта іх палеская мова, яе трапны каларыт, П. Ціхановіч вырашае стварыць сваю родную, беларускую граматыку. Агульнавядома, без роднай мовы няма патрыятызму. Матчына мова – спрадвеку лічылася найвялікшым скарбам народа. Таму, каб не згубіць прыгажосць і багацце роднага слова, зберагчы мясцовыя слоўныя каштоўнасці, моўную трапнасць Платон Ціхановіч амаль за дзесяць гадоў сабраў надзвычай багаты і самабытны мясцовы матэрыял. Закончыў работу над рукапісам ў канцы 1874 года. Сабраныя матэрыялы склалі асобную працу, якая атрымала назву “Беларуская Граматыка”. Нельга не адзначыць, што праца палескага святара цікавая тым, што пабудавана на міні-дыялогах людзей, палешукоў, з іх непаўторнай каларытнай гаворкай.

Ў студзені 1875 г. П. Ціхановіч начыста перапісаў сваю граматыку і адправіў у камітэт па правядзенню конкурса на стварэнне падручнікаў для школ Паўночна-Заходняга краю. Конкурс праводзіўся Мінскай дырэкцыяй народных вучылішчаў Мінскай губерні, пад патранажам Віленскай навучальнай акругі [1, с.80].

Што стала з граматыкай далей – аб гэтым можна толькі меркаваць, а на падставе шэрагу ўскосных доказаў яе знікнення і месцазнаходжання зрабіць выснову, што шматгадовая праца святара П. Ціхановіча не была надрукавана.

Палессу

Тайну зніклага рукапісу ўдалося раскрыць дзякуючы М. Елянеўскаму, які звярнуў увагу на спасылку літаратураведа Г. Каханоўскага у кнізе “Адчыніся таямніца часу”, дзе той ссылаецца на Літоўскі цэнтральны дзяржаўны архіў [2]. За вялікія грошы была атрымана электронная копія “не учебник, а художественное произведение, написанное языком того времени и тех людей, которые на нем разговаривали”[1, с. 42].

Час не стаіць на месцы і сёння мы можам даведацца пра добрыя справы свайго славутага земляка. Дзякуючы пошукавым намаганням Мікалая Елянеўскага была знойдзена біяграфія Ціхановіча, напісаная ім уласнаручна ў 1889 годзе ў сувязі з прадстаўленнем беларускага пастыра да высокай дзяржаўнай узнагароды. І як сцвярджаецца у лютаўскім загадзе 1890 года:

“Государь император, по всеподданнейшему докладу Кавалерской Думы ордена Святой Анны, в 3-й день февраля сего года, Всемилостивейше соизволил, согласно удостоению Святейшего Синода, пожаловать сей орден 3-й степени священнику церкви села Лунин Пинского уезда Платону Тихоновичу – за 25-летние труды по народному образованию”[2].

За дабрачынную службу і прыкладнае выкананне сваіх пастырскіх абавязкаў Платон Максімавіч быў адзначаны высокімі духоўнымі і свецкімі ўзнагародамі: бронзавым медалём на стужцы “За усердие”, “за полезную и усердную службу” аксамітавай фіялетавай скуф'ёю.

У 1902 г. Святы Сінод удастоіў Ціхановіча ўзнагароджання за заслугі па духоўнаму ведамству наперсным крыжам [1, с. 197], а ў 1910 г. святар быў узнагароджаны залатым наперсным крыжам па ўказу Імператара – за 50-гадовы юбілей служэння Святой Царкве [1, с. 203].

Яго паслужны спіс са шматлікімі ўзнагародамі сведчыць пра тое, што Платон Ціхановіч з вялікай стараннасцю служыў Богу і дапамагаў людзям.

У 1919 годзе ва ўзросце 83 гадоў Платон Максімавіч піша ў Мінск прашэнне аб сваей адстаўцы. У адным з царкоўных фармуляраў, падобным да дзённіка вясковага

жыцця, у 1919 годзе рукой 83-гадовага П.М. Ціхановіча напісаны такі радок: “Убыл из Лунина 10 декабря” [2].

Мяркуюць, што пакінуўшы царкоўную службу Платон Ціхановіч пераязджае да пляменніцы у Пагост-Загарадскі, што знаходзіцца ў Пінскім павеце. Праз некалькі гадоў, у 1922 г., памёр і пахаваны на мясцовых могілках. Аднак і гэтая частка жыцця, па сцвярджэнню М. Елянеўскага, высвечана не вельмі дакладна [2].

У вёсцы Вылазы, дзе нарадзіўся Ціхановіч, захавалася царква Ражства Багародзцы 1787 года пабудовы, занесеная ў рэестр ахоўваемых дзяржавай

помнікаў.

Некаторыя штрыхі ў гісторыю з’яўлення “Беларускай граматыкі” Платона Ціхановіча ўнёс вядомы беларускі краязнавец, гісторык і пісьменнік Г. Каханоўскі. У канцы 70-х гадоў мінулага стагоддзя ён звярнуўся да творчай спадчыны Платона Максімавіча і не ставячы пад сумненне назваў яго першаадкрывальнікам беларускай граматыкі [3, с. 147]. У кнізе “Адчыніся, таямніца часу», надрукаваную ў 1984 годзе ў выдавецтве “Мастацкая літаратура”, Г. Каханоўскі прысвяціў гэтай тэме невялікую главу пад назвай “Філолаг Ціхановіч”.

Даследчык піша: “Трымаю ў руках напісаную акуратным почыркам рукапісную працу, а больш дакладна – частку яе, пад назвай “Язык. Частка першая. Св. Платон Ціхановіч. М. Лунін. 31 студзеня 1875 года”. Напісана работа на шаснаццаці старонках васьмі вялікафарматных аркушаў [3, с. 147].

Рукапісная граматыка створана на дзвюх мовах – рускай і беларускай, таму што на той момант беларуская мова была пад забаронай у імперыі.

На падставе ўсяго сказанага можна зрабіць выснову, што граматыка Платона Ціхановіча стала першай навуковай працай па праваслаўнай культуры на беларусскай землі, ўзорам самабытнай духоўнай творчасці.

Чытаючы рукапіс яшчэ раз пераконваешся, што мова народа бессмяротная. Фразеалагізмы, абароты гаворкі, якія прыкмеціў Ціхановіч і ўвёў у навуковае даследаванне, і сёння жывуць сярод лунінчан.

Са стагоддзя ў стагоддзе, з пакалення ў пакаленне пераходзяць, напрыклад, фразеалагізмы, якія запісаў Платон Ціхановіч ў сваёй граматыцы: “Он яки коминок хороши, мае быть его недавно зробили... А скылечки я тоби виноват грошей?.. А где наш котко? Оньде пыд лаўкою седить, а ты й не бачышь... А куды гэтые дрова несешь? Ох, якое вяликае барыло чоловик понис. Як вын одужае его нести?.. Що ты берессa не за свое дило. Чы ты гэтую рэч зробиш так, як слидно?”

Краязнавец М. Елянеўскі адзначае, што артыкул выдатнага філолага прафесара Варшаўскага універсітэта Яўхіма Карскага “Да пытання аб этнаграфічнай карце беларускага племені”, надрукаваны ім у “Літоўскіх епархіяльных ведамасцях” у 1902 годзе, мае аднолькавыя моманты з граматыкай Ціхановіча [1, с.80].

Мікалай Еляненеўскі меркаваў, што Ціхановіч напісаў і другую частку граматыкі, куды ўвайшлі прымаўкі, легенды, народныя песні... [2]. Аднак, грунтоўных гістарычных звестак пакуль што не сустракалася і аб гэтым можна зрабіць здагадку толькі на падставе шэрагу ўскосных доказаў, альбо даць новы імпульс пошуку.

Такім чынам, Платон Максімовіч ўвайшоў у гісторыю Беларусі, як прадаўжальнік духоўнай традыцыі.

Лёсу і справе Платона Ціхановіча прысвечаны раманхроніка “Время пастыря” Мікалая Елянеўскага. У 2008 г. раман прызнаны лепшым творам года на праваслаўную тэматыку і адзначаны Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь і Беларускай Праваслаўнай Царквой Дыпломам 1 ступені, а у 2011 г. аўтар рамана стаў Лаўрэатам абласной літаратурнай прэміі імя У. Калесніка ў намінацыі “Проза”.

Свае культурныя карані трэба ведаць усім. Каб маладое пакаленне пра гэта сумленна памятала, супрацоўнікі бібліятэкі ПалесДУ дапамагаюць чытачам асвойваць свет з пазіцыі традыцый і гісторыі духоўнай культуры.

Святару-асветніку Платону Ціхановічу і яго “Беларускай граматыцы” супрацоўнікі бібліятэкі прысвяцілі прэзентацыю рамана-хронікі М. Елянещскага “Время пастыря”, падрыхтавалі і надрукавалі буклет “Спадчына Платона Ціха-

Полесгу

новіча”, афармлялі выставу “Асветнікі зямлі Пінскай”, змяшчалі публікацыі ў газеце “УниВестник”(ПалесДУ) “Страчаная спадчына”, “Просвещение через книгу”.

Імя Платона Максімавіча Ціхановіча – наша гісторыя і гонар, і наш святы абавязак, як сучаснікаў, памятаць аб сваёй нацыянальнай спадчыне.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Еленевский, Н.В. Время пастыря : роман-хроника / Н. В. Еленевский. – Минск : Четыре четверти, 2011. – 216 с. – (Библиотека Союза писателей Беларуси)

2. Еленевский, Н.В. Грамматика священника Платона Тихоновича / Н.В. Еленевский // Полесская правда. – 2006. – № 105/106, № 107. – С. 1,4.

3. Коласаў, Л. Філолаг Ціхановіч / Л. Коласаў // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Лунінецкага раёна. – Мінск : Беларусь, 1995. – С. 147-149.

4. Палескі сьвятар-мовазнаўца Платон Ціхановіч. – [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://jacviah.livejournal.com/41077.html, свободный. – Дата обращения : 10.10.2017.

ПолесГУ